## РЭФЕРАТ

Справаздача 152 с., 1 кн., 136 крын.

ЛІНГВАКРАІНАЗНАЎСТВА, НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ СЕМАНТЫКА, БРЭСТЧЫНА, МОЎНА-КУЛЬТУРНАЯ СЕМАНТЫКА, БЕЗЭКВІВАЛЕНТНАЯ ЛЕКСІКА, ОНІМ, МОЎНАЯ АДЗІНКА

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца безэквівалентная лексіка, онімы (мікратапонімы, заонімы, мянушкі), лексіка ўстойлівых адзінак, дыялектызмы і ўстарэлыя словы, выбраныя з твораў пісьменнікаў Брэстчыны; прадметам – нацыянальна-культурная семантыка моўных адзінак.

Мэта працы – комплекснае вывучэнне сувязі моўных адзінак з культурай, гісторыяй, побытам жыхароў Брэстчыны; вызначэнне намінатыўных ажзінак з нацыянальна-культурнай семантыкай.

Для лінгвакраязнаўчага вывучэння моўных адзінак намі выкарыстоўваліся лінгвакультуралагічны, апісальны, сацыялінгвістычны і псіхалінгвістычны метады даследавання.

Вынікі работы і іх навізна. Праведзена комплекснае вывучэнне намінатыўных адзінак дыялектнай і літаратурнай мовы пісьменнікаў Брэстчыны – безэквівалентнай лексікі; онімаў (мянушка, мікратапонім, заонім); безэквівалентнай і фонавай лексікі ў складзе ўстойліваых адзінак; дыялектызмаў і ўстарэлых слоў, выбраных з мастацкіх твораў пісьменнікаў Брэстчыны. Выяўлены спецыфічныя асаблівасці онімаў, у якіх зафіксаваны культурна-гістарычны вопыт беларусаў-палешукоў; вывучана нацыянальна-культурная семантыка дыялектнай безэквівалентнай лексікі Брэстчыны; устаноўлена, што больш выразна нацыянальна-культурную семантыку адлюстроўваюць назвы прадметаў і паняццяў, якія характэрныя для духоўнай культуры і матэрыяльнага побыту, а таксама назвы, абумоўленыя асаблівасцямі прыроднага і геапалітычнага становішча Брэстчыны.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны для навуковай тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі лінгвакультуралогіі, лінгвістычнага краязнаўства і этналінгвістыкі; для падрыхтоўкі і выдання вучэбных дапаможнікаў і слоўнікаў; для арганізацыі вучэбна-метадычных семінараў і лекцый для педагогаў. Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца пры чытанні лекцый па беларускай дыялекталогіі і этналінгвістыцы, па лінгвістычным краязнаўстве і лінгвакультуралогіі, пры напісанні курсавых, дыпломных і магістарскіх работ; пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры ў сярэдніх агульнаадукацыйных школах (атрымана 9 актаў укаранення).

Напрацоўкі могуць паслужыць зыходным матэрыялам для работы па лінгвакультуралагічным даследаванні гаворак Брэстчыны ў агульнамоўным кантэксце.